**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА - КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Касакевич И.А.
для рассмотрения
24.08.2017

16.12.2016 г. № 11-01-01/13

Ваўкавыскі раённы
выканаўчы камітэт

**2. Аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Веды і навыкі па вырабу традыцыйнага вясельнага каравая на Ваўкавышчыне".**

Заслухаўшы інфармацыю намесніка дырэктара ДУК "Ваўкавыскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці рамёстваў" Рашчэўскай Л.І. і экспертнае заключэнне загадчыка аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Валодзінай Т.В. аб элеменце нематэрыяльнай культурнай спадчыны аб ведах і навыках па вырабу традыцыйнага вясельнага каравая, якія захавалася і перадаюцца на тэрыторыі Ваўкавыскага раёна, ВЫРАШЫЛІ:

1.1. Прыняць да ўвагі, што веды і навыкі па вырабу традыцыйнага вясельнага каравая на Ваўкавышчыне з'яўляюцца адметнай асаблівасцю і абавязковым атрыбутам, якія выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы і правядзенні вяселля;

1.2. Адзначыць, што вясельны каравай з'яўляецца сімвалам дабрабыту і багацця, паяднання роду, даўгалецця шлюбнага саюзу, вернасці, адметны сваімі разнастайнымі ўпрыгожваннямі, сярод якіх прымяняюцца фігуркі музыкаў з рознымі музычнымі інструментамі на першым ярусе каравая, сватоў і сведкаў – на другім, маладых – на трэцім, верхнім;

1.3. Пагадзіцца з неабходнасцю надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыі "Б" нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека – "Комплекс ведаў і навыкаў па вырабу традыцыйнага вясельнага каравая на Ваўкавышчыне".

Намеснік Міністра,
Старшыня навукова-метадычнай рады А.А.Яцко

Н Хоцар 209 43 87